Б. П. САВІЦКІ
В. Я. СІДАРОВІЧ

Выдра ў Беларусі

Б. П. САВІЦКІ
В. Я. СІДАРОВІЧ

выдра ў Беларусі

ЭКАЛАГІЧНЫ НАРЫС

МІНСК
«НАВУКА І ТЭХНІКА»
1993

ББК 28.693.36
С 34
УДК 599.742.4

Рэцэнзент
Э. Р. Самусенка

Фотаздымкі
В. Я. Сідаровіча, В. Я. Сугойдзя,
І. І. Бышнева

Малюнкі
С. У. Салука

Савіцкі Б. П., Сідаровіч В. Я.
С 34 Выдра ў Беларусі: Экал. нарыс.— Мн.: Навука і тэхніка, 1993.— 55 с., іл.

У папулярнай форме распавядаецца пра асаблівасці экалогіі аднаго з цікавейшых відаў фауны Беларусі — выдры рачной. На аснове шматгадовых назіранняў аўтары апісваюць знешні выгляд, лад жыцця і характэрныя асаблівасці жыццядзейнасці звера. Падаюцца звесткі аб распаўсюджанні і колькасці выдры ў Беларусі, разглядаюцца праблемы яе аховы і рацыянальнага промыслу.

Кніжка разлічана на біёлагаў, паляўнічых і паляўнічазнаўцаў, а таксама на шырокае кола аматараў прыроды.

1907000000—093
С——————БЗ 24—93
М 316(03)—93

ISBN 5-343-01132-2

ББК 28.693.36

© Б. П. Савіцкі,
В. Я. Сідаровіч,
1993

Замест прадмовы

Выдра — бадай, самы цікавы і найменш даследаваны прадстаўнік драпежных сысуноў. Жыццё звера цесна звязана з вадаёмам, дзе ён здабывае сабе корм. Умовы існавання выдры даволі складаныя, калі ўлічыць жорсткую ўнутрывідавую барацьбу з прычыны абмежаванасці мясцін, больш-менш прыдатных для яе жыцця. Да таго ж і чалавек, імкнучыся ахапіць сваёй дзейнасцю як мага большую тэрыторыю, мімаволі парушае месцы існавання гэтага драпежніка. Значна пагаршаюцца ўмовы існавання выдры з надыходам ледаставу, які абмяжоўвае доступ да вады. Нельга пакінуць убаку і тое, што дзякуючы вельмі прыгожаму і трываламу футру звер з'яўляецца заманлівай здабычай для паляўнічых і асабліва для браканьераў.

Усё гэта абумовіла развіццё ў выдры дастаткова складаных формаў паводзін, розных экалагічных прыстасаванняў і папуляцыйных рэгуляцый. Праведзеныя даследаванні пацвердзілі, што выдра — перспектыўны для антрапагенных ландшафтаў від. Аднак адмоўнае ўздзеянне чалавека і ўплыў прыродных фактараў бываюць настолькі значныя, што адной экалагічнай пластычнасці недастаткова, каб забяспечыць нармальны стан папуляцыі. Таму ў значнай частцы арэалу выдра з'яўляецца рэдкім відам фауны, а месцамі наогул знікае. Неабходны дзейсныя захады па ахове і рацыяналізацыі промыс-



лу выдры, па аптымізацыі яе асяроддзя і перш за ўсё на антрапагенных вадаёмах. Усё гэта вымагае дасканалага вывучэння экалогіі віду. Даступнае выкладанне гэтых аспектаў — мэта нашай публікацыі.

Нарыс прызначаецца не толькі спецыялістам-эколагам. Аўтары мелі на мэце прывабіць да аб'екта сваіх назіранняў увагу шматлікіх аматараў прыроды — усіх, хто хоча спазнаць багацце і хараство навакольля, зазірнуць у яго таямніцы.

Якая яна, выдра?

Выдра вядзе напаўводнае жыццё, і яе цела вельмі добра прыстасаванае для гэтага. Яно мае выцягнутую форму і трохі патоўшчанае ў задняй частцы, з маленькай пляскатай галавой. Абцякальная форма цела забяспечвае лёгкасць руху як у тоўшчы, так і на паверхні вады. Лапы кароткія, даволі тоўстыя з перапонкамі паміж пальцаў, хвост гнуткі, моцны, звужаны к канцу. І футра незвычайнае — настолькі шчыльнае, што зусім не прамакае.

2. Зак. 807





Звер сярэдніх памераў. Даўжыня цела дарослага самца — 82—117, самкі — 66—102 сантыметры, даўжыня галавы — 13—16 сантыметраў. Дадайце да гэтага хвост, даўжыня якога дасягае ў самцоў 38—57, у самак — 35—50 сантыметраў. Маса цела самцоў вагаецца ад 6,5 да 12, самак — ад 5,6 да 8,6 кілаграма. Маладыя выдры значна меншыя за дарослых, а адрозненні паміж самцамі і самкамі па памерах і масе цела праяўляюцца ўжо на першым годзе жыцця.

Памеры чэрапа дарослых выдраў: кандзілабазальная даўжыня 100—121 міліметр, скулавая шырыня — 58—77, найвялікшая вышыня 37—44 міліметры. Зубная сістэма дарослых асобін мае 12 разцоў, 4 клыкі, 14 папярэдне- і 6 заднекарэнных зубоў.

Выдра добра нырае, больш таго, яна можа знаходзіцца пад вадою да 4 хвілін. Гэтая здольнасць тлумачыцца тым, што, калі звер дае нырца, спецыяльныя складкі ў насавых адтулінах і слыхавых

праходах змыкаюцца і зачыняюць іх. Грабучы лапамі, яна рухаецца ў вадзе павольна, а прыціскаючы лапы да тулава і выцінаючыся тулавам і хвастом, паскарае рух. Па сушы выдра рухаецца пераважна скачкамі, а бывае — і крокам. Хуткасць такога перамяшчэння складае адпаведна 3 і 8—13 кіламетраў у гадзіну. У сярэднім жа, рухаючыся па сушы і ў вадзе, выдра з улікам прыпынкаў за гадзіну пакрывае адлегласць 1,5 кіламетра.

Футра ў выдры вельмі прыгожае: спіна цёмна-карычневая, чэрава, шыя і галава трохі святлейшыя — жаўтаватыя ці бялёсыя, у залежнасці ад узросту. Поўсць жорсткая, высокая, даволі густая, падшэрстак мяккі, нізкі і вельмі густы.

Нягледзячы на такое цёплае «адзенне» выдра не можа доўгі час знаходзіцца ў вадзе. Каб пазбегнуць пераахаладжэння пры паступовым намаканні валасянога покрыва, яна вымушана праз кожныя 15—25 хвілін знаходжання ў вадзе выходзіць на бераг — атрэсціся і абсохнуць, а пры неабходнасці і адпачыць.

Дзе і як жыве выдра?

Від выдраў, пра які ідзе гаворка (*Lutra lutra* L.), насяляе большую частку Еўразіі і крайні паўночны захад Афрыкі. У нашай краіне ён распаўсюджаны амаль па ўсёй тэрыторыі, акрамя крайняй цэнтральнай поўначы, паўночнага ўсходу і некаторых паўднёвых раёнаў. У Беларусі выдра жыве паўсюдна і з'яўляецца, за невялікімі выключэннямі, звычайным відам фауны.

Як ужо паміналася, выдра селіцца ля вадаёмаў. У Беларусі на вадатоках (рэкі, каналы) яна жыве пастаянна, а каля нецякучых вадаёмаў (азёры,





вадасховішчы, рыбаводчыя і іншыя сажалкі) — толькі ў бязлёдны перыяд, бо інакш звер не мае доступу да вады.

Найбольш прыдатныя месцы існавання выдра знаходзіць на паўнаводных, хутка- ці ўмерана цякучых рэках з крутымі, парослымі берагамі, асабліва калі гэтыя рэкі нясуць свае воды праз ледніковыя азёры. Тут дастатковыя запасы рыбы, слабаабмежаваны доступ да вады ў часе ледаставу ды і добрая схованка.

З меншай шчыльнасцю засяляюцца выдрамі павольныя рэкі з нізкімі забалочанымі берагамі. Тут, праўда, болей рыбы, але затое дрэнны доступ вады ў перыядзе ледаставу і мала надзейнай схованкі.

У пошуках найбольш спрыяльных умоў выдра выбірае тыя рэкі, у пойме якіх шмат азёраў і старыц. Такія пойменныя вадаёмы багатыя на рыбу, што значна паляпшае кармавыя ўмовы.



На меліярацыйных каналах селішчы выдры сустракаюцца рэдка: тут меней корму, дрэнны подступ да вады ў часе ледаставу і неспрыяльныя кармавыя ўмовы. Перавагу яна аддае паўнаводным каналам з дастатковым запасам рыбы, а таксама больш старым, паколькі з цягам часу экалагічныя ўмовы тут паляпшаюцца.

У бязлёдны перыяд выдра знаходзіць прыдатныя ўмовы на ледніковых азёрах, вадасховішчах і рыбаводчых сажалках, дзе багата рыбы. Аднак калі берагі такіх вадаёмаў пакатыя, не парослыя дрэвамі, хмызняком або залішне забалочаныя, засяленне іх выдраю абмяжоўваецца адсутнасцю надзейнай схованкі. Наадварот, шматлікія астраўкі з добрым раслінным покрывам прываблліваюць звера.

Сховішчам і жытлом для выдры служаць бабровыя хаткі і норы, якія гаспадары наведваюць рэдка ці наогул пакінулі. Не грэбуе яна і пашыранымі андатравымі норамі або вымоінамі ля каранёў дрэў, што растуць па беразе. Хады ў сховішчы бываюць і з-пад вады, і з берагу, але апошнімі выдра карыстаецца часцей. На «сваёй» тэрыторыі выдра мае 10—30 такіх сховішчаў. Яны размешчаны нераўнамерна і звычайна прыстасаваныя да больш пажыўных месцаў. Самыя зручныя сховішчы выдра наведвае часта — ад некалькіх разоў на суткі да аднаго разу ў трое сутак. Іншымі, менш зручнымі сховішчамі выдра карыстаецца час ад часу, прыблізна адзін раз у 5—10 і болей сутак. Зрэдку ў якасці сховішча звер выкарыстоўвае густыя зараснікі на беразе вадаёмаў.

На меліярацыйных каналах акрамя пакінутых бабрамі нор і паўхатак выдра мае сховішча ў дрэнажных, ліўневых ці іншых трубах, пад масткамі ў

3. Зак. 807

нішах на стыках іх з грунтам, у вымоінах пад плітамі каля шлюзаў і мастоў.

Жытло самкі, дзе яна нараджае і вырошчвае шчанюкоў,— гэта звычайна вялікая камера, якая знаходзіцца вышэй паводкавага ўзроўню вады і мае 1—3 хады ў ваду і на бераг. Камера абавязкова высцілаецца сухой травой.

Для выдры характэрная змрочна-начная актыўнасць з двума пікамі: на змярканні і на досвітку. Месцам адпачынку звычайна служыць адно са сховішчаў, а ў бясснежны час — і адкрытыя лёжкі на беразе вадаёма або на востраве.

Жывуць выдры адзіночна і сем'ямі. Выдрыная сям'я — гэта звычайна самка (маці) са шчанюкамі і рэдка — з дарослым самцом (бацька). Выдра-адзіночка альбо сям'я маюць свой асабісты ўчастак існавання, межы якога мецяцца экскрэментамі, мачой і выдзяленнямі прыанальных залоз. Мецяць яны і сховішчы, а таксама асноўныя месцы здабычы корму. Гэтыя меткі маюць вялікае значэнне ў размеркаванні тэрыторый паміж звярамі. Аднак, нягледзячы на падкрэслена «тэрытарыяльныя» паводзіны, пры сустрэчы выдры не б'юцца, а, абнюхаўшы адзін аднаго і пакінуўшы меткі, мірна разыходзяцца.

На вялікіх і сярэдніх рэках у спрыяльных умовах існавання тэрытарыяльныя паводзіны праяўляюцца слабей, таму паляўнічыя ўчасткі тут непастаянныя і часта перакрываюцца. Адваротная з'ява назіраецца на малых вадатоках. Ва ўмовах поўнага засялення выдрамі рэк працягласць іх індывідуальных участкаў на вялікіх і сярэдніх рэках 3—5 кіламетраў, на малых — ад 3 да 8 кіламетраў. Іх памеры вызначаюцца кармавымі ўмовамі (запас рыбы) і магчымасцю доступу да вады ў перыяд ледаставу. Таму на малых рэках з выпраўленым рэчышчам


Маркіроўка тэрыторыі
Харчаванне: наяўнасць корму
Харчаванне: доступ да корму ў часе ледаставу
Размнажэнне
Ахоўныя ўмовы
Адпачынак
Месцы канцэнтрацыі асноўнага корму
Незамерзлыя віры
Утварэнне пусталёдзіны
Наяўнасць нор і загусценняў раслінасці
Пясчаныя наносы
Пойменныя вадаемы
Загусценні раслінасці і яе рэшткаў на беразе
Лясныя завалы і наносы на вадатоку
Зарастаючыя мелкаводдзі
Паглыбленні ля берага
Хуткае цячэнне на перакатах
Адносна высокія, крутыя берагі, парослыя лесам, хмызняком

і іншых меліярацыйных каналах, дзе кармавыя ўмовы больш кепскія, памеры ўчасткаў існавання звера большыя: ад 6 да 11 (у сярэднім 7,6) кіламетраў. На малых вадатоках будаўнічая дзейнасць баброў значна паляпшае ўмовы існавання выдраў, што абумоўлівае змяншэнне тэрыторый, якія яны займаюць.

Адносна большыя ўчасткі асвойваюць выдрыныя сем'і, асабліва тыя, дзе ёсць дарослы самец, да таго ж і знаходзяцца гэтыя ўчасткі ў больш спрыяльных умовах.

Перазразмеркаванне ўчасткаў існавання ў папуляцыі выдры часта адбываецца з прычыны змянення іерархічнага становішча іх насельнікаў. Дарэчы, вышэйшае іерархічнае становішча маюць самкі з вывадкам або цяжарныя. На ранг ніжэй — дарослыя самцы і ялавыя дарослыя самкі. Самае ж нізкае становішча ў іерархічнай сістэме папуляцыі выдры маюць асобіны на другім годзе жыцця, якія пачынаюць самастойнае жыццё. Гэтыя выдры займаюць свабодныя тэрыторыі, а гэта часцей за ўсё меліярацыйныя каналы з невялікім участкам ракі або з маленькай рачулкай.

Хоць выдры і займаюць пэўную тэрыторыю, дзе жывуць нейкі час пастаянна, аднак яны нярэдка перамяшчаюцца на даволі значную адлегласць або вандруюць. Звычайна гэта звязана з брачным перыядам (гонам), перазразмеркаваннем участкаў існавання пры зменах у іерархічным становішчы асобін, а таксама з перасяленнем у часе ледаставу з ледніковых азёраў, вадасховішчаў і іншых нецякучых вадаёмаў на рэкі, а пасля ледаставу — у адваротным напрамку.

Сляды жыццядзейнасці выдры

Месцы, дзе жыве выдра, няцяжка вызначыць па слядах яе жыццядзейнасці. Гэта адбіткі лап, экскрэменты, тэрытарыяльныя меткі, рэшткі корму, сцежкі, лёжкі, занятыя норы і г. д. Гэтыя «доказы» яе прысутнасці можна напаткаць непасрэдна ля вадаёма, часцей за ўсё на беразе.

Адбіткі лап выдры складаюцца з чатырох (пе-

раважна на пярэднім) або пяці (на заднім, радзей на пярэднім) пальцавых і кіпцюрных адбіткаў і вялікага пятачнага адбітку. Даўжыня адбітку задняй лапы дарослых самцоў звычайна 8—13, самак — 7—11 сантыметраў, у маладых асобін адбіткі значна меншыя. Таму па памерах адбіткаў задняй лапы можна вызначыць, да якой узроставай групы належыць асобіна. Цікава, што пры адначасовым знаходжанні адбіткаў задніх лап, кучкі экскрэментаў і мачы можна вызначыць нават пол выдры, бо ў самцоў мача знаходзіцца наперадзе кучкі экскрэментаў, а ў самак — на экскрэментах або трохі ззаду ад іх адносна адбіткаў задніх лап.

Перамяшчаецца выдра па-рознаму: калі рухаецца крокам, то адбіткі лап аддаленыя адзін ад аднаго на 4—12 сантыметраў, калі ж скачкамі, то след звера — гэта чацвёркі, радзей тройкі або двойкі адбіткаў лап на адлегласці 20—40 сантыметраў адзін ад аднаго. У залежнасці ад субстрату след выдры таксама выглядае па-рознаму. Там, дзе выд-





Даўжыня адбіткаў задняй лапы выдраў рознага полу адпаведна ўзроставай групе

Узроставая група	Самцы	Самкі
Першы год жыцця	5,0—6,3	4,0—5,0
Другі год жыцця	6,4—8,0	5,1—6,5
Трэці год жыцця і болей	8,1—13,5	6,6—11,9

ра ходзіць часта, утвараюцца сцежкі, асабліва на карацейшых пераходах ад ракі да пойменных азёраў, на выгіне ракі.

Па краях пясчаных кос, на камянях, што ўздымаюцца над вадою, на ствалах паваленых дрэў можна знайсці выдрыныя туалеты. Экскрэменты выдры часцей акруглай формы і складаюцца з фекалію і неператраўленых цвёрдых рэшткаў корму, такіх, як луска і косці рыб, косці жаб, цвёрдыя по-



крывы рачных ракаў і інш. Звычайна фекалій чорнага колеру. Значна радзей экскрэменты маюць цыліндрычную форму. У іх складзе пераважаюць цвёрдыя рэшткі, часцей за ўсё поўсць дробных млекакормячых ці пер'е птушак; фекалію мала.

Пастаянныя лёжкі выдры можна напаткаць на беразе ці на востраве ў густой высокай траве, у курцінках маладога ельніку, пад нахіленымі дрэвамі і ў хмызняку. Абавязковая ўмова лёжкі — параўнальна сухая гіграскапічная глеба, якая добра паглынае ваду з валасянога покрыва. Таму часовыя лёжкі можна назіраць адкрыта на пясчаных косах. На лёжцы ў цёплы час года выдра разграбае падсцілку, у халодны звычайна высцілае яе сухой травой. Зрэдку, асабліва ў адлігу, выдра на кароткі час кладзецца на снег.





Там, дзе рака мае высокія крутыя берагі, можна часам натрапіць на ўтаптаныя спускі, па якіх выдра слізгае зверху ўніз на чэраве. Тое ж самае можна назіраць і на снезе на роўным месцы. Верагодна, выдра робіць гэта не толькі дзеля забавы, але і выціскае такім чынам сваё футра пасля выхаду з вады.

У месцах існавання сям'і здараецца сустрэць укатаныя спускі з берагавых схілаў, утрамбаваныя пляцоўкі наверсе і ўнізе. Гэта пляцоўкі для гульняў. Дарэчы, гульні шчанюкоў паміж сабою і з маці вельмі спрыяюць іх развіццю.

Чым і як выдра корміцца?

Выдра здабывае корм пераважна ў вадаёме і толькі зрэдку — на беразе. Асноўным яе кормам з'яўляецца рыба. Паводле нашых падлікаў, ва ўмовах Беларусі на паўнаводных прыродных вадаёмах (вялікія і сярэднія рэкі, азёры) сустракальнасць рыбы ў рацыёне выдры складае 70 працэнтаў, на малых рэках яна меншая — каля 50 працэнтаў. На паўнаводных антрапагенных вадаёмах (вадасховішчы, розныя паўнаводныя каналы, сажалкі) выдра харчуецца рыбай не менш часта, на малаводных (каналізаваныя малыя рэкі і каналы асушальнай меліярацыі) — значна радзей (адпаведна 73 і 38 працэнтаў).

Аснову рацыёну звера складаюць акунёвыя (акунь і ёрш) — у сярэднім 33 працэнты, карпавыя (плотка, гусцяра, язь, карась) — ад 19 да 40 (у сярэднім 29) працэнтаў, а таксама шчупак — ад 17 да 23 (у сярэднім 20) працэнтаў. А вось на каналах і ў сажалках рыбаводчых гаспадарак 88 працэнтаў рыбы, якую з'ядае выдра, складае карп.

Звычайна выдра ловіць невялікую рыбу масай да 200 грамаў, значна радзей яе здабычаю бывае рыба масай ад 300 грамаў да 3 кілаграмаў. На рыб-



адзіночак, якія хутка плаваюць (шчупак, налім, фарэль і інш.) выдра нападае знянацку, другіх жа, асабліва ў зграі, яна даганяе.

Кормячыся ў асноўным рыбай, выдра аказвае пэўны ўплыў на іхтыяфауну вадаёмаў. Узнікае пытанне: ці не з'яўляецца выдра шкоднікам рыбнай гаспадаркі? Праведзеныя даследаванні даюць адмоўны адказ на гэтае пытанне. Наадварот, у некаторых выпадках такую драпежную дзейнасць звера можна разглядаць як дапамогу чалавеку. Раскажам пра гэта больш падрабязна.

Усе віды рыб, калі зыходзіць з інтарэсаў рыбнай гаспадаркі, падзяляюцца на дзве групы: прамысловыя і малакаштоўныя. Прамысловыя, параўнальна вялікія па памерах хуткарастучыя віды — гэта лешч, язь, лінь, срэбны карась, карп, судак, шчупак і інш. Да малакаштоўных аднесены маленькія, павольна-

растучыя віды: плытва, чырвонапёрка, вярхоўка, пешчур, вуклея, уюн, акунь, ёрш і г. д. Малакаштоўныя рыбы з'яўляюцца харчовымі канкурэнтамі, а часам і ворагамі прамысловых рыб, таму што з'ядаюць іх ікру ці малькоў. Такім чынам, вялікая колькасць малакаштоўнай рыбы ў вадаёмах абумоўлівае меншую колькасць рыбы прамысловых відаў. Таму для павелічэння рыбапрадукцыйнасці прыродных і антрапагенных вадаёмаў адным з асноўных рыбагаспадарчых мерапрыемстваў з'яўляецца памяншэнне колькасці малакаштоўнай рыбы.

Паводле даследаванняў В. П. Родзікава, на рэках і азёрах Палесся аснову гадавога рацыёну выдры складаюць малакаштоўныя віды рыб — ад 65 да 82 працэнтаў. Калі прыняць гадавы рыбны рацыён за 300 кілаграмаў, то атрымліваецца, што адна выдра ў залежнасці ад кармавых умоў вадаёма за год з'ядае ад 195 да 246 кілаграмаў малакаштоўнай рыбы, што, безумоўна, ідзе на карысць рыбнай гаспадарцы.

Любіць выдра паласавацца і рачнымі ракамі. У некаторых месцах сустракальнасць іх у яе рацыёне дасягае 53 (у сярэднім 7) працэнтаў.

Пры недахопе рыбы і ракаў у вадаёме выдра часта паядае амфібій, пераважна жаб розных відаў. І ўжо зусім невялікая роля ў харчаванні выдры належыць насякомым (пераважна плавунцы і іх лічынкі), малюскам (начовачкі), рэптыліям (яшчаркі, вужы), птушкам (часцей за ўсё качкі), дробным сысунам (палёўкі) і андатры.

Сезонныя змены ў харчаванні выдры значна праяўляюцца толькі на малых вадатоках і цалкам вызначаюцца колькасцю і даступнасцю галоўнага корму — рыбы. Так, доля рыбы ў рацыёне звера значна







павялічваецца ў час яе нерасту; амфібій — у час асенняй канцэнтрацыі травяных жаб ля вадаёмаў, а таксама ў час іх зімоўкі ў вадаёмах і ў перыяд вясновай актыўнасці і нерасту. У цёплы перыяд года на ўсіх вадаёмах павялічваецца доля ў харчаванні выдры насякомых і птушак.

Звычайна ва ўмовах Беларусі гадавы рацыён выдры, які ацэньваецца па масе спажываемых кармоў,— гэта 70—75 працэнтаў рыбы і 10—20 працэнтаў амфібій. Іншы корм складае часам усяго 5—10 працэнтаў гадавога рацыёну.

Цікавыя даследаванні па харчаванні выдры правёў М. М. Рукоўскі. Ён паказаў, якім чынам у арганізм выдры трапляюць мінеральныя рэчывы і вітаміны. Аказваецца, што ва ўмовах няволі, дзе выдру кормяць буйной рыбай і мясам, яна адчувае дэфіцыт гэтых рэчываў, што вядзе да значнага пагаршэння стану і нават хвароб. Іншая справа — у прыродзе! Тут выдра звычайна ловіць дробную траваедную рыбу і разам з ёю перапрацоўлівае змесціва трававальнага тракту ахвяры, у якім ёсць значная колькасць рэшткаў расліннага корму. У выніку з кілаграмам з'едзенай рыбы выдра атрымоўвае каля 130 грамаў расліннага корму ў даступным для яе арганізма стане.

Выдра хапае і ўтрымлівае корм сківіцамі з вострымі і доўгімі клыкамі. Часам пры здабычы корму яна дапамагае сабе пярэднімі лапамі, якія маюць рухавыя суставы і вострыя, цэпкія кіпцюры.

Запасаў корму выдра звычайна не робіць. У харчаванні яна эканомная і здабывае столькі, колькі адолее з'есці адразу. У сярэднім выдра з'ядае за дзень каля 1 кілаграма корму, аднак гэтая велічыня вагаецца па сезонах і ў залежнасці ад полу, узросту і фізіялагічнага стану асобіны.

Пры абмежаванні доступу да вады ў часе ледаставу ўмовы існавання значна пагаршаюцца. Трапіць у ваду ў гэты час выдра можа толькі на незамерзлых вірах. Карыстаецца яна і бабровымі кармавымі, пакінутымі жыллёвымі норамі, а таксама хаткамі, хады з якіх у ваду не замярзаюць. Часам, каб дабрацца да вады, выдра робіць ход у гнілым пні, які тырчыць з вады, купіне, а то нават і ў тонкім лёдзе. Калі на працягу зімы значна паніжаецца ўзровень вады, то ўтвараюцца пусталёдзіны. Лёд тут часта праломваецца, што таксама дае зверу доступ да вады. Увогуле, такія вось пусталёдзіны з праломамі лёду, калі да іх ёсць хады з бабровых нор, адыгрываюць значную ролю ў існаванні выдры ў другой палове зімы.

Узаемаадносіны з бабрамі і норкамі: ворагі ці сябры?

Як жыхары вадаёмаў выдры цесна кантактуюць з іншымі каляводнымі сысунамі: бабрамі, еўрапейскімі і амерыканскімі норкамі.

Бабры вядомыя сваімі будаўнічымі інстынктамі. Іх будаўнічая дзейнасць значна паляпшае ўмовы існавання выдры, а на некаторых вадатоках (меліярацыйныя каналы, ручаі) яна якраз і стварае мінімум экалагічных умоў для звера.

Адзін з найбольш важных для выдраў элементаў будаўнічай дзейнасці баброў — стварэнне імі нор і хатак. Самі выдры будуюць сабе жытло і сховішчы вельмі неахвотна, паколькі іх пярэднія лапы дрэнна прыстасаваныя для капання. Таму ў якасці сховішчаў яны звычайна карыстаюцца бабровымі хаткамі ці норамі, а цяжарныя самкі ахвотна нараджаюць тут дзіцянят. Свабоднымі звычайна аказваюцца норы і хаткі на пакінутых паселішчах баброў, ці рэдка карыстаемыя бабрамі кармавыя норы. На вялікіх і сярэдніх рэках выдры часта займаюць паводкавыя норы баброў, уваход у якія ў час, калі няма паводкі, знаходзіцца высока над паверхняй вады (1—2,5 метра). Гэта непрымальна для баброў, а вось для выдры — у самы раз. Дарэчы памянуць яшчэ адну абставіну: у часе ледаставу хады ў ваду

з бабровых хатак і нор не замярзаюць, што вельмі важна для выдры пры здабычы корму.

У сажалках, што ствараюць бабры на меліярацыйных каналах, малых рэках ці ручаях, перагароджваючы іх плацінамі, запасы рыбы значна большыя, чым на саміх гэтых вадатоках. Сустракальнасць рыбы ў рацыёне павялічваецца тут на 2—41 (у сярэднім на 9) працэнт. Запасы іншых кармоў у такіх сажалках таксама большыя. Такім чынам, страты энергіі на здабычу корму памяншаюцца. Такая палёгка вельмі адчуваецца ў неспрыяльны перыяд ледаставу.

Норка для выдры таксама не з'яўляецца ворагам. На малых вадатоках адносіны паміж жывёлінамі гэтых відаў маюць канкурэнтны характар, што абмяжоўвае шчыльнасць насельніцтва норак, фізічна больш слабых і горш прыстасаваных для здабычы корму ў вадзе.

У залежнасці ад канкрэтных умоў вадаёма і навакольных біятопаў канкурэнтныя ўзаемаадносіны паміж напаўводнымі драпежнікамі могуць быць як слабавыражанымі, так і вострымі, напружанымі. Прыроднымі фактарамі, якія аслабляюць канкурэнцыю, з'яўляюцца: наяўнасць шырокай забалочанай, са шматлікімі вадаёмамі, поймы і высокіх, парослых лесам берагоў; будаўнічая дзейнасць баброў, асабліва стварэнне імі сістэмы сажалак на малых рэках і каналах; масавая зімоўка ў вадатоку травяной жабы. Усё гэта паляпшае забеспячэнне выдраў і норак кормам у неспрыяльным зімовым перыядзе, а таксама дае магчымасць норкам часова перайсці на харчаванне кормам, непрыймальным для выдры (дробныя сысуны) або другасным (жабы). Адчувальна аслабляе канкурэнцыю паміж каляводнымі сысунамі здабыча іх чалавекам, што разрэджвае папуляцыі і тым самым памяншае спажыванне агульнага корму.

Высвятленне ўзаемаадносін паміж выдрамі і норкамі шляхам фізічнай барацьбы здараецца вельмі рэдка. Звычайна яны абмяжоўваюцца мірным спаборніцтвам за выкарыстанне аднолькавых рэсурсаў асяроддзя — кармоў, месцаў доступу да вады ў перыяд ледаставу, сховішчаў і жытла.

Як выдра размнажаецца?

Гэтае пытанне працягвае заставацца найменш вывучаным у біялогіі выдры. Таму даць вычарпальны адказ на яго, на жаль, немагчыма. І чым глыбей даследчык пранікае ў гэтую таямніцу, тым больш неасветленых бакоў адкрываецца яго погляду. Аднак, абапіраючыся на вынікі шматгадовых даследаванняў шэрага вучоных, можна скласці хоць прыблізнае ўяўленне аб гэтым працэсе.

Самкі выдры звычайна становяцца палаваспелымі ва ўзросце двух гадоў, самцы — трох ці чатырох. Спароўванне можа адбывацца ў розную пару года, але часцей у лютым—сакавіку і ў жніўні—верасні. Да самкі заляцаюцца некалькі самцоў. Паміж кавалерамі, як водзіцца, узнікаюць бойкі, і ўрэшце з самкай застаецца мацнейшы з самцоў. Астатнія пакідаюць участак, дзе жыве самка.

Шлюбныя гульні суправаджаюцца характэрнымі гукамі: свістам і верашчаннем. Спароўваюцца выдры звычайна ў вадзе. Шлюбны перыяд працягваецца 5—7 дзён, а потым самкі пачынаюць выказваць агрэсіўнасць у адносінах да самцоў.

Нерацыянальны промысел выдры (ліцэнзійны, а часцей браканьерскі) паніжае шчыльнасць папуляцыі і парушае яе палавую структуру. Складваец-



ца такое размеркаванне дарослых асобін на тэрыторыі, пры якім патэнцыяльныя партнёры для размнажэння вельмі аддаленыя адзін ад аднаго. Гэта значна ўскладняе стварэнне шлюбных пар. У выніку некаторыя дарослыя самкі (да 24 працэнтаў) застаюцца ялавыя, што адчувальна зніжае тэмпы аднаўлення папуляцыі.

Працягласць цяжарнасці самак выдры ў няволі складае ад 51 да 73 дзён. У прыродных умовах гэты тэрмін значна вагаецца — ад 2 да 10—13 месяцаў. Зацягванне цяжарнасці тлумачыцца існаваннем латэнтнай (скрытай) стадыі, калі ў неспрыяльны перыяд (напрыклад, у часе ледаставу) развіццё эмбрыёну прыпыняецца. З гэтай прычыны самкі выдры нараджаюць дзіцянят звычайна не часцей, як раз у два гады.

Шчаняцца выдры звычайна ў красавіку—маі і ў кастрычніку—лістападзе, зрэдку і ў іншыя месяцы

года. Адразу пасля нараджэння вывадак складваецца з 1—4 (у сярэднім 2,6) шчанюкоў.

Нованароджаныя выдраняты маюць кароткі мяккі мех карычнева-шэрага колеру. Мех густейшы на верхняй частцы цела і зусім рэдкі на чэраве. Нараджаюцца выдраняты сляпымі, бяззубымі, з закрытымі слухавымі адтулінамі. Важаць яны ўсяго 150—300 грамаў. У месячным узросце мех становіцца зусім карычневы, прарэзваюцца вочы, вага павялічваецца да 700—850 грамаў.

Выдраняты застаюцца ў сховішчы, дзе яны нарадзіліся, да 2,5—3-месячнага ўзросту. Самка корміць шчанюкоў малаком каля 2 месяцаў. Пасля кармлення яна старанна гладзіць языком іх чэраўкі, каб малако нармальна перетраўлівалася. У 2-месячным узросце выдраняты пачынаюць есці корм, які здабывае маці: рыбу, рачных ракаў, а таксама амфібій. Часта самка прыносіць жывую здабычу; тады дзіцяняты забіваюць яе самастойна або часам з'ядаюць жыўцом. Наеўшыся, выдраняты, як усе малыя, пачынаюць гуляць з рэшткамі корму, адбіраючы іх адзін у аднаго. На трэцім месяцы маці пачынае вучыць дзіцянят плаваць і ныраць. Пры гэтым яна бярэ шчанюка за поўсць зубамі, зацягвае ў ваду і адпускае. Затым падхоплівае яго і дае нырца. Выдраняты цялёпкаюцца і паступова вучацца плаваць і ныраць.

Калі шчанюкі дасягаюць 2,5—3-месячнага ўзросту, самка з вывадкам пачынае вандраваць па сваім ўчастку, прыпыняючыся ў больш пажыўных месцах з добрай схованкай. Да 8—10-месячнага ўзросту выдраняты не адстаюць ад самкі. Яна бярэ на сябе ўвесь клопат аб моладзі — корміць, вучыць іх здабываць ежу, знаходзіць і ўладкоўваць сховішчы і жытло, меціць тэрыторыю і г. д. Самец рэдка бярэ ўдзел у выхаванні маладых.

У фізічным выхаванні шчанюкоў значную ролю адыгрываюць іх гульні паміж сабою і з маці. Месцам для гэтага занятку выдрыная сям'я выбірае спускі з берагавога схілу, невялікія пляцоўкі на гары і ўнізе, ля вады.

У вывадкавым перыядзе выдраняты часта гінуць. Іх смяротнасць у залежнасці ад розных умоў складае ад 28 да 70 (у сярэднім 43) працэнтаў. Асабліва вялікая яна ў папуляцыях, якія эксплуатуюцца, — у сярэднім 52 працэнты. Калі маці становіцца ахвярай чалавека, выдраняты ва ўзросце да 8—10 месяцаў яшчэ не здольныя доўга існаваць самастойна і ў хуткім часе гінуць ад голаду. Здараецца, яны становяцца здабычай драпежнікаў (воўк, рэдка ліса) або паляўнічых і бяздомных сабак, гінуць ад захворванняў (у асноўным чума пладажэрных), а таксама ад голаду пры неспрыяльных умовах у часе ледаставу.

Ва ўзросце 8—10 месяцаў выдраняты становяцца адносна самастойнымі, але на ўчастку існавання маці яны жывуць яшчэ не менш як год—паўтара. Маладыя выдры з сем'яў, якія распаліся, маюць самае нізкае іерархічнае становішча ў папуляцыі. З гэтай прычыны пры рассяленні яны вымушаны займаць толькі свабодныя ўчасткі вадаёмаў. Пры нармальнай структуры папуляцыі незанятымі застаюцца самыя кепскія ўчасткі (меліярацыйныя каналы з участкам ракі ці без яго), якія і становяцца месцамі існавання моладзі. Аднак пры нізкай шчыльнасці папуляцыі, звязанай з празмерным промыслам, нават на такіх участках можна знайсці добрыя ўмовы існавання.

Колькі выдра жыве?

Жывуць выдры нядоўга. Ва ўмовах аховы яны дажываюць да 13—15 гадоў, а на тэрыторыях, дзе вядзецца паляванне,— да 8—10. Сярэдні ж узрост звера складае ўсяго каля 3,5 года. Галоўная прычына скарачэння працягласці жыцця выдры — інтэнсіўная здабыча яе чалавекам, як ліцэнзійная, так і браканьерская. Апошняя, на жаль, пераважае. Здабываюць выдру звычайна капканамі. Іх ставяць у вадзе або на глебе ў месцах, якія звер наведвае часцей за ўсё: на сцежках, лёжках, каля нор, тэрытарыяльных метак. Шмат выдраў гіне ў капканах, пастаўленых паляўнічымі на бабра падчас ліцэнзійнага промыслу, бо яны, як вядома, часта карыстаюцца бабровымі сховішчамі, сцежкамі і хадамі. Сур'ёзную пагрозу жыццю звера ўяўляюць таксама рыбалоўныя сеткі і іншыя снасці. Гінуць выдры і ад захворванняў (чума пладажэрных), а таксама ад знясілення пры недахопе ежы.

З-за нядбайнасці працаўнікоў прамысловасці і сельскай гаспадаркі пачасціліся выпадкі моцнага забруджвання вадаёмаў атрутнымі рэчывамі. Гэта вядзе часам да масавай гібелі водных і каляводных жывёл, у тым ліку і выдры. Такія выпадкі неаднаразова здараліся ў шмат якіх рэгіёнах арэала выдры і ў Беларусі таксама.

Шэраг даследчыкаў прытрымліваюцца мерка-

складае 2,9 асобіны на 10 кіламетраў вадатоку.

Шчыльнасць папуляцый выдры ў басейнах вялікіх рэк у асноўным залежыць ад гушчыні і тыпалагічнай структуры гэтых сістэм вадаёмаў. Басейн Заходняй Дзвіны, напрыклад, вызначаецца большай гушчынёй рачной сеткі, хуткім і ўмераным цячэннем рэк, невялікай колькасцю малых рэк з каналізаваным рэчышчам і вялікай колькасцю ледніковых азёраў. Таму тут найбольшая фактычная шчыльнасць папуляцыі выдры — каля 6,5 (патэнцыяльная — каля 10,7) асобіны на 100 квадратных кіламетраў тэрыторыі. Для басейна Прыпяці, наадварот, характэрны малая гушчыня рачной сеткі, вялікая доля каналізаваных малых рэк, больш павольнае цячэнне. Шчыльнасць папуляцыі выдраў тут найменшая — каля 2,1, патэнцыяльная — каля 3,7 асобіны на 100 квадратных кіламетраў тэрыторыі. У басейнах Нёмана і Дняпра шчыльнасць папуляцыі звера складае фактычна каля 4,2, патэнцыяльна — каля 6,6 асобіны на пазначанай плошчы.

Агульная фактычная колькасць выдраў у Беларусі па стане на 1986—1988 гады складала каля 12 тысяч асобін: у басейне Заходняй Дзвіны — 3,5 тысячы, Нёмана — 2,3, Дняпра — 4,0, Прыпяці — 1,6 тысячы. Аднак за апошнія два гады яна значна паменшылася — прыблізна ў 1,5, а месцамі ў 2 разы. Гэтаму, магчыма, садзейнічалі цёплыя зімы амаль без снегу і ледаставу 1988—1989 і 1989—1990 гадоў. Такое на першы погляд недарэчлівае тлумачэнне мае рацыю. Справа ў тым, што такія ўмовы надвор'я саслужылі добрую службу браканьерам у здабычы каштоўнага звера. І як вынік празмернага «палявання» — зніжэнне пагалоўя да 7 тыс. асобін.

Патэнцыяльная колькасць выдры для тэрыторыі Беларусі складае зараз каля 19 тысяч асобін.

Колькі выдраў на Беларусі?

У залежнасці ад умоў існавання і інтэнсіўнасці промыслу (ліцэнзійны і браканьерскі) шчыльнасць выдры на вадаёмах розная.

На вялікіх і сярэдніх рэках фактычная шчыльнасць насельніцтва выдры мяняецца ад 1 да 3,9 (у сярэднім 2,5) асобіны на 10 кіламетраў вадатоку. Яна большая пры вышэйшай хуткасці цячэння рэк, залежыць ад колькасці вадаёмаў у пойме: азёраў, заток, малых рэк і ручаёў; спрыяльнай з'яўляецца і большая шчыльнасць насельніцтва баброў. Празмерны промысел выдры прывёў да таго, што большасць вадаёмаў недазаселены ёю. Патэнцыяльная шчыльнасць насельніцтва (суадносная экалагічнай ёмістасці месцаіснаванняў на вялікіх і сярэдніх рэках) на 0,2—0,9 асобіны большая за фактычную і ў сярэднім складае 3,2 асобіны на 10 кіламетраў вадатоку.

На малых рэках з прыродным рэчышчам фактычная шчыльнасць насельніцтва выдры ў залежнасці ад хуткасці цячэння, структуры берагоў, шчыльнасці засялення і характару будаўнічай дзейнасці баброў вагаецца ад 1,0 да 2,7 і ў сярэднім складае 1,9 асобіны на 10 кіламетраў вадатоку. Патэнцыяльная шчыльнасць у гэтых месцах перавышае фактычную на 0,7—1,3 асобіны і ў сярэднім

складае 2,9 асобіны на 10 кіламетраў вадатоку.

Шчыльнасць папуляцый выдры ў басейнах вялікіх рэк у асноўным залежыць ад гушчыні і тыпалагічнай структуры гэтых сістэм вадаёмаў. Басейн Заходняй Дзвіны, напрыклад, вызначаецца большай гушчынёй рачной сеткі, хуткім і ўмераным цячэннем рэк, невялікай колькасцю малых рэк з каналізаваным рэчышчам і вялікай колькасцю ледніковых азёраў. Таму тут найбольшая фактычная шчыльнасць папуляцыі выдры — каля 6,5 (патэнцыяльная — каля 10,7) асобіны на 100 квадратных кіламетраў тэрыторыі. Для басейна Прыпяці, наадварот, характэрны малая гушчыня рачной сеткі, вялікая доля каналізаваных малых рэк, больш павольнае цячэнне. Шчыльнасць папуляцыі выдраў тут найменшая — каля 2,1, патэнцыяльная — каля 3,7 асобіны на 100 квадратных кіламетраў тэрыторыі. У басейнах Нёмана і Дняпра шчыльнасць папуляцыі звера складае фактычна каля 4,2, патэнцыяльна — каля 6,6 асобіны на пазначанай плошчы.

Агульная фактычная колькасць выдраў у Беларусі па стане на 1986—1988 гады складала каля 12 тысяч асобін: у басейне Заходняй Дзвіны — 3,5 тысячы, Нёмана — 2,3, Дняпра — 4,0, Прыпяці — 1,6 тысячы. Аднак за апошнія два гады яна значна паменшылася — прыблізна ў 1,5, а месцамі ў 2 разы. Гэтаму, магчыма, садзейнічалі цёплыя зімы амаль без снегу і ледаставу 1988—1989 і 1989—1990 гадоў. Такое на першы погляд недарэчлівае тлумачэнне мае рацыю. Справа ў тым, што такія ўмовы надвор'я саслужылі добрую службу браканьерам у здабычы каштоўнага звера. І як вынік празмернага «паляванння» — зніжэнне пагалоўя да 7 тыс. асобін.

Патэнцыяльная колькасць выдры для тэрыторыі Беларусі складае зараз каля 19 тысяч асобін.

Выдра і чалавек

Цяжка знайсці чалавека (нават сярод браканьераў), якому не была б даспадобы выдра — кемлівы, асцярожны, моцны, смелы і адначасова забаўны і добры звер. Ён мае няўклюдную знешнасць з доўгім тулавам і кароткімі крывымі канечнасцямі, доўгім, тоўстым хвастом, але між тым валодае надзіва дасканалай пластыкай рухаў у вадзе.

Апошнім часам узрасла папулярнасць утрымання звера ў няволі, хаця гэта даволі складана. Выдры неабходна дастаткова вялікая вальера (плошчаю 10—20 квадратных метраў), басейн з вадой (аб'ёмам 1—2 кубічных метра) і паўнацэнны рацыён, значную частку якога павінна складаць рыба (хаця яна ахвотна есць і мяса). Да таго ж звер вымагае шмат увагі і клопату.

З чалавекам выдра звыкаецца даволі лёгка, асабліва маладая. Але па-сапраўднаму яна прывязваецца да гаспадара, толькі калі жыве побач з самага ранняга ўзросту — ад аднаго да трох месяцаў. Нягледзячы на тое што выдра добра прыручаецца, атрымаць ад яе патомства ў няволі вельмі складана, таму яе звычайна не разводзяць на звераферамах.

Пэўных поспехаў па гадаванню выдры ў няволі

дамагліся ў Новасібірскім заапарку (Р. А. Шыла) і Біялагічным інстытуце СА АН СССР (В. А. Шыла). Тут штогод амаль усе самкі выдры шчэняцца, а з выдранят вырастаюць паўнацэнныя дарослыя асобіны, здольныя да размнажэння. Смяротнасць сярод моладзі і дарослых жывёлін невялікая. Размнажэнне выдры ў няволі засвоена таксама ў Англіі і Германіі.

З вялікай «сімпатыяй» чалавек ставіцца і да выдрынай шкуркі. Футра выдры — адно з найбольш

каштоўных. Яно лічыцца эталонам трываласці і да таго ж вельмі прыгожае: жорсткая, высокая, сярэдняй гушчыні поўсць і мяккі, нізкі і вельмі густы падшэрстак. Акрамя таго, мех выдры вельмі цёплы і даволі лёгкі. Таму з даўніх часоў звер з'яўляецца вельмі заманлівай здабычай для чалавека.

Акрамя дзяржаўнага (па ліцэнзіях) промыслу, да гэтай пары, на жаль, добра «развіты» і браканьерскі. Так, патэнцыяльны прырост колькасці выдры ў Беларусі зараз складае каля тысячы асобін. Аднак на справе колькасць звера не павялічваецца, бо не меней асобін здабываецца браканьерамі (ліцэнзійны адлоў складае ўсяго 30—70 жывёлін на год). Выдру імкнецца здабыць, за невялікім выключэннем, кожны, хто больш-менш здольны гэта зрабіць.

Як паказваюць праведзеныя даследаванні, такі стыхійны промысел звера вельмі нерацыянальны. Перш за ўсё ён празмерны (як правіла, здабываецца больш асобін, чым складае патэнцыяльны прырост), а таксама прыгнечвае аднаўленне (гінуць шчанюкі злоўленых самак) і парушае папуляцыйную структуру. У выніку — фактычная колькасць выдры значна меншая за патэнцыяльную (у Беларусі — 12 супраць 19 тысяч асобін); адзначаецца зніжэнне патэнцыяльнага прыросту (каля 10 замест 15—17 працэнтаў).

Яшчэ адзін негатыўны бок адносін чалавека да выдры — гэта змяненне прыродных вадаёмаў, у выніку чаго значна пагаршаюцца, а нярэдка зусім знішчаюцца месцы яе існавання. Неспрыяльна ўплывае на ўмовы існавання выдры выпрамленне рэчышчаў малых рэк, асушэнне поймы, змяненне прыроднай структуры берагоў: высечка расліннасці, разбурэнне нор і шмат што іншае. Трэба сур'ёз-

на ўсвядоміць гэта і тэрмінова зрабіць эфектыўныя ахоўныя захады, таму што знішчэнне прыродных месцаў існавання выдры — справа яшчэ горшая, чым нерацыянальная эксплуатацыя яе папуляцый. Калі колькасць звера і нармальны стан папуляцый аднавіць усё ж магчыма, то аднаўленне неабходнай якасці месцаў яго існавання — задача значна больш цяжкая.

Дапаможам выдры

У выніку шматбаковай гаспадарчай дзейнасці чалавека змяняецца або наогул знікае шмат прыродных вадаёмаў, асабліва малых. Але яшчэ больш ствараецца новых: гэта каналы асушальнай меліярацыі, вадасховішчы, рыбаводчыя і іншыя сажалкі, каналы, што забяспечваюць вадой гарады, падтрымліваюць узровень вады ў сажалках і вадасховішчах. Большасць антрапагенных вадаёмаў пастаянна або часова засяляецца выдрамі. Аднак шчыльнасць яе насельнікаў на гэтых вадаёмах звычайна вельмі малая. Тут мала сховішчаў, няма доступу да вады ў часе ледаставу, неспрыяльныя кармавыя ўмовы.

Аптымізаваўшы асяроддзе існавання выдры на антрапагенных вадаёмах, можна было б з упэўненасцю казаць пра перспектыўнасць гэтага віду ва ўмовах антрапагеннага ландшафту. Выдры не замінае прысутнасць чалавека ў месцах яе існавання, але толькі тады, калі хапае надзейных сховішчаў.

Дзеля аптымізацыі асяроддзя выдры на каналах неабходна праз 200—300 метраў усталёўваць штучныя керамічныя сховішчы адпаведных памераў з жылой камерай, а таксама хадамі ў ваду і на паверхню. Да таго ж такія сховішчы забяспеч-





ваюць схованку і доступ да вады ў неспрыяльны перыяд ледаставу.

Стык берага канала з вадою трэба рабіць крутым, а бераг хаця б праз кожныя 200—300 метраў неабходна засадзіць бярозай або вярбой. На рыбаводчых і іншых сажалках, на вадасховішчах для існавання выдры патрабуецца стварэнне невялікіх штучных астравоў, парослых дрэвамі або хмызняком. Берагі такіх астравоў павінны таксама быць крутыя і мець штучныя сховішчы.

Існуе магчымасць палепшыць умовы існавання віду, напрыклад, на павольных рэках. Істотна абмяжоўвае шчыльнасць выдры на гэтых вадаёмах кепскі доступ да вады напачатку ледаставу. Каб папраўіць такое становішча, неабходна праз кожныя 700—900 метраў устанавіць на вадатоку драўляныя бруіры, якія створаць магутную плынь вады ля паверхні і не дадуць ёй замерзнуць. Яны складаюцца з плаціны, якая мае токавую адтуліну для канцэнтрацыі патоку вады, і з экрана для накіравання яго да паверхні. Такія прылады дастаткова эфектыўныя, танныя і адпавядаюць экалагічным запатрабаванням.

Усе захады па аптымізацыі асяроддзя выдры будуць эфектыўныя толькі тады, калі будзе існаваць рацыянальны падыход да эксплуатацыі яе папуляцый. Неабходна, каб шчыльнасць папуляцый звера адпавядала экалагічнай ёмістасці яе асяроддзя. Для гэтага трэба ліквідаваць (ці хаця б скараціць да мінімуму) браканьерства і ўвесці навукова абгрунтаванае абмежаванне яе ліцэнзійнага промыслу. Кантроль за аднаўленнем пагалоўя выдры лепш ажыццяўляць, узяўшы за паказчык засяленне зверам меліярацыйных каналаў. Гэта зручны і дакладны індыкатар.

Промысел не павінны быць празмерным. Пры нармальным стане папуляцыі велічыня прамысловай нагрузкі на яе не павінна перавышаць 15 працэнтаў. Полаўзроставае размеркаванне прамысловай нагрузкі трэба весці ў адпаведнасці з полаўзроставай структурай папуляцыі з нармальным аднаўленнем: асобін на першым годзе жыцця — 27—29 працэнтаў, на другім — 14—16, на трэцім і болей — 56—58 працэнтаў; суадносіны самцоў і самак ва ўсіх узроставых групах павінны быць прыблізна роўныя. З гэтай мэтай у час перадпрамысловай разведкі

неабходна вызначыць (па адбітках, як тлумачылася вышэй) пол і ўзроставую групу выдраў на паляўнічых плошчах і толькі ўслед за гэтым можна ажыццяўляць промысел — выбарачна, адпаведна вызначаным полаўзроставым суадносінам.

Асаблівасці размнажэння выдры (шчаненне на працягу года, працягласць вывадкавага перыяду 1—1,5 года) вымагаюць ашчаджальнага рэжыму яе промыслу. Тут павінны быць рацыянальны падыход. Як вядома, дарослыя самкі з вывадкам звычайна засяляюць экалагічна ёмістыя месцы існавання.







Схема бруіра: а, б — аснова (від спераду і збоку); в — прыстасаванне для накіравання патоку вады да паверхні вадатоку рознай глыбіні; г — размяшчэнне токавай адтуліны ў аснове бруіра на прамым і звілістым участках вадатоку



Таму некаторыя сістэмы вадаёмаў (ледніковыя азёры, злучаныя сістэмай рэк, адносна паўнаводныя малыя рэкі з хуткім цячэннем, участкі сярэдніх і вялікіх рэк са значнай колькасцю вадаёмаў у пойме) з'яўляюцца аднаўленчымі цэнтрамі папуляцый і менавіта тут неабходна стварыць заказнікі — участкі для аднаўлення выдры.

Такое комплекснае вырашэнне работнікамі аховы прыроды, паляўнічай і воднай гаспадаркі пытанняў рацыянальнага падыходу да эксплуатацыі і аховы папуляцыі выдры забяспечыць значны рост нарыхтовак яе каштоўных шкурак і, што найбольш важна, будзе гарантаваць захаванне і нармальны стан папуляцый гэтага цікавейшага віду жывёл.

Змест

Замест прадмовы 3
Якая яна, выдра? 5
Дзе і як выдра жыве? 9
Сляды жыццядзейнасці выдры 17
Чым і як выдра корміцца? 25
Узаемаадносіны з бабрамі і норкамі: ворагі ці сябры? 33
Як выдра размнажаецца? 37
Колькі выдра жыве? 41
Колькі выдраў на Беларусі? 43
Выдра і чалавек 45
Дапаможам выдры 49

Навукова-папулярнае выданне

САВІЦКІ БАРЫС ПАРФЁНАВІЧ
СІДАРОВІЧ ВАДЗІМ ЯЎГЕНАВІЧ

ВЫДРА Ў БЕЛАРУСІ
Экалагічны нарыс

Загадчык рэдакцыі М. Дз. Гесь
Рэдактар Л. А. Коржава
Мастак М. А. Жахавец
Мастацкі рэдактар В. А. Жахавец
Тэхнічны рэдактар Л. А. Карнеева
Карэктар З. Я. Губашына

Здадзена ў набор 19.07.91. Падпісана ў друк 06.09.93. Фармат 70×100 1/32. Папера друк. № 1. Гарнітура журнальна-рубленая. Высокі друк. Ум. друк. арк. 2,26. Ум. фарб.-адб. 2,42. Ул.-выд. арк. 1,92. Тыраж 2000 экз. Зак. № 807. Цана 40 р. Выдавецтва «Навука і тэхніка» Акадэміі навук Беларусі і Дзяржаўнага камітэта па друку Рэспублікі Беларусь. 220141. Мінск, Жодзінская, 18. ЛВ № 437. Друкарня імя Францыска Скарыны выдавецтва «Навука і тэхніка». 220141. Мінск, Жодзінская, 18.